ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

**Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 г. у беларускіх СМІ**

Бюлетэнь №4

*(16 –22 жніўня 2008 г.)*

Мэта маніторынгу – вызначыць, наколькі поўна ды ўсебакова беларускія медыя асвятляюць выбарчы працэс і дзейнасць тых суб’ектаў (як асобаў, так і структур), што ўдзельнічаюць у ім, а таксама наколькі апублікаваныя матэрыялы адпавядаюць прынцыпам журналісцкай этыкі і прафесійным стандартам журналісцкай працы падчас выбараў.

У аналізаваны перыяд завершыўся прыём дакументаў для рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, выбарчыя камісіі прыступілі да іх праверкі, ЦВК вызначыў час і СМІ, праз якія кандыдаты звернуцца да выбарцаў, а назіральнікі БДІПЧ АБСЕ прыступілі да доўгатэрміновага маніторынгу выбарчай кампаніі.

Аналіз БАЖ ахоплівае 20 сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта: тэлевізійныя і радыёпраграмы *“Наши новости» (ОНТ), “Панорама недели”* (*Першы Нацыянальны канал БТ*), *“Навіны рэгіёна”* (Гомель), *“Новости-Регион” / ТРК “Магілёў”,“Радыёфакт” (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), “Навіны”, Гомельскае абласное радыё (101.3 FM*), *“Навіны”, абласное радыё ТРК “Магілёў”,* газеты *“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”, “Рэспубліка”, “Белорусы и рынок”, “Народная воля”, “«Комсомольская правда» в Белоруссии”; “Брестский кур’ер”, “Гомельская праўда”, “Могилёвская правда”, “Днепровская Неделя”,* інтэрнет-рэсурсы www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by і інтэрнет-версія *“Еўрапейскага радыё для Беларусі”* www.euroradio.fm.

## Асноўныя вынікі і некаторыя высновы

Як і ў папярэднія перыяды, дзяржаўных медыя засяродзілі сваю ўвагу на арганізацыйным аспекце выбарчага працэсу, рэпрэзентуючы ЦВК і выбарчыя камісіі ніжэйшага ўзроўню ў якасці галоўных яго суб’ектаў. **Акрамя** назіральнікаў з краін СНД і заходніх назіральнікаў, яны, як правіла, не вылучалі іншых дзеючых асобаў. Па-за канкурэнцыяй пры гэтым заставаўся прэзідэнт краіны (да 70% часу і плошчы параўнальна з астатнімі суб’ектамі).

Колькасць часу і плошчы, адведзеных выбарчаму працэсу адносна іншых тэмаў, не толькі не павялічылася ў гэты перыяд, але ў некаторых дзяржаўных электронных медыя нават зменшылася. Гэтак, агульнанацыянальнае ТБ (*праграма “Наши новости” ОНТ*) адвяла выбарчаму працэсу столькі ж часу, што і ў папярэдні перыяд (у межах 6 хвілін). А вось праграма *“Панорама недели” (17.08.08) (Першы нацыянальны канал БТ)* увогуле не ўзгадала пра выбары. Праігнаравала гэтую тэму і гомельская тэлепраграма *“Навіны рэгіёна”*. А *“Гомельскае абласное радыё”(101.3 FM*) абмежавалася 25 секундамі.

У ранейшай манеры - г. зн., надаючы прагнозу надвор’я ўвагі больш, чым выбрам, - асвятляла выбарчы працэс праграма *“Навіны”* (*абласное радыё ТРК “Магілёў”*). Выключэннем з правіла была дзяржаўная праграма *“Радыёфакт” (Першы нацыянальны канал беларускага радыё)*, якая амаль 32,5% часу прысвяціла тэме выбараў. Але колькасць

рэпрэзентаваных ёю суб’ектаў (6) паказвае на тое, што дзяржаўныя медыя працягваюць асвятляць выбарчы працэс, кіруючыся надзвычай спрошчанай схемай, якая ігнаруе многіх дзеючых асобаў.

Дзяржаўная агульнанацыянальная і рэгіянальная прэса таксама не акцэнтавалі ўвагу ні на выбарчым працэсе, ні на шырокім коле яго ўдзельнікаў. Гэтак, *“СБ”* галоўным чынам рэпрэзентавала *ЦВК* і толькі мімаходзь згадала *КПБ, ЛДП і АГП.* Газета *“Рэспубліка”* яшчэ меней пісала пра *ЦВК*, а сярод астатніх суб’ектаў усяго аднойчы напісала пра *назіральнікаў з СНД і заходніх назіральнікаў*.

Недзяржаўная прэса хоць і не рэпрэзентавала ў згаданы перыяд шырокае кола суб’ектаў выбарчага працэсу, аднак гэтай тэме надала, параўнальна з дзяржаўнымі друкаванымі СМІ, больш увагі. Гэтак, у пераліку на адзін нумар, тыднёвік *“Белорусы и рынок”* адвёў тэме выбараў плошчы ў 2,5 разы болей за *“СБ”*. А *“Брестский кур’ер”* – у 3 разы болей за *“Гомельскую праўду”*.

Дзяржаўны інтэрнет-рэсурс www.belta.by асноўную частку сваёй віртуальнай плошчы аддаў 8 суб’ектам выбарчага працэсу: *ЦВК, Прэзідэнту, назіральнікам з краін СНД, мясцовым уладам, палітычным партыям, акруговым выбарчым камісіям, заходнім назіральнікам і ўчастковым выбарчым камісіям.* Астатнія (14) суб’ектаў толькі ўзгадваюцца.

Недзяржаўныя www.naviny.by і www.tut.by , як і ў папярэдні перыяд, асвятлялі дзейнасць шырэйшага кола суб’ектаў выбарчага працэсу (адпаведна 29 і 28). Пры гэтым пра дзейнасць *ЦВК* ды іншых выбарчых камісій яны пісалі не нашмат меней за сайт БЕЛТА. Але непараўнальна болей - пра іншых палітычных суб’ектаў.

Што тычыцца манеры рэпрэзентацыі суб’ектаў выбарчага працэсу і іх дзейнасці, то дзяржаўныя медыя пераважна нейтральна асвятлялі дзейнасць *ЦВК і іншых выбарчых камісій*. У асноўным нейтральна ацэньвалі яны і дзейнасць *назіральнікаў*, хаця некаторыя з іх і адвялі больш месца і часу *назіральнікам ад СНД*. Напрыклад, сайт БЕЛТА *назіральнікам ад СНД* адвёў віртуальнай плошчы амаль у 4 разы болей, чым заходнім назіральнікам. А пра беларускіх назіральнікаў большасць дзяржаўных медыя нават і не ўзгадваюць.

Ігнаруючы значную колькасць суб’ектаў выбарчага працэсу, дзяржаўныя СМІ, калі і ўзгадвалі апазіцыю, дык выказвалі пераважна негатыўнае стаўленне да яе. Менавіта такім чынам інтэрнет-рэсурс БЕЛТА ацаніў ролю апазіцыйных палітычных партый, якім, паводле слоў сакратара ЦВК М. Лазавіка, з прычыны ўнутрыпартыйных разборак “*не остается сил, чтобы заниматься социально-экономическими вопросами, которые должны быть в основе политики и которые волнуют избирателей"* (http://news.belta.by/ru/news/archive?date=20_08_2008&page=1&id=260683). Нізкай актыўнасцю партый сайт тлумачыць таксама малы адсотак (0,2%) прадстаўнікоў апазіцыйных партый на выбарчых участках (http://news.belta.by/ru/news/archive?date=20_08_2008&page=1&id=260735).

Як адзначалася вышэй, у аналізаваны перыяд ЦВК зацвердзіў графік размеркавання эфірнага часу для выступаў кандыдатаў (http://news.belta.by/ru/news/archive?date=22_08_2008&page=2&id=261537). Звяртае на сябе ўвагу тое, што эфірны час па тэлебачанні будзе прадастаўляцца з 18.00 да 18.30, а ў вялікіх гарадах і Мінску – з 17.30 да 18.30. (Выступы прэтэндэнтаў у Мінску будуць трансляваца па тэлеканале “Лад”). Гэта азначае, што большасць працуючых выбарцаў у

вялікіх гарадах, якія ў гэты час знаходзяцца па дарозе з працы альбо робяць закупы ў крамах, не змогуць пазнаёміцца з выбарчымі праграмамі кандыдатаў у дэпутаты.

Не спрыяе камунікацыі з выбарцамі і тое, што кандыдаты ў дэпутаты ў вялікіх гарадах будуць выступаць не на “галоўных” (самых рэйтынгавых) агульнанацыянальных тэлевізійных каналах. Дарэчы адзначыць, што перадвыбарную агітацыю істотным чынам абмяжоўваюць таксама надзвычай малыя сродкі, выдаткаваныя кандыдатам на выраб агітацыйных матэрыялаў, - гэта прызнаў і сакратар ЦВК М. Лазавік (http://news.tut.by/politics/115352.html).

**Зробім высновы**

Дзяржаўныя медыя, асвятляючы галоўным чынам дзейнасць ЦВК, пакінулі па-за ўвагай выбарцаў іншых суб’ектаў выбарчай кампаніі. У гэтых медыя дамінавала спрошчаная схема асвятлення выбарчага працэсу.

Плошча і час, адведзеныя ў аналізаваны перыяд выбарчай тэматыцы у дзяржаўных медыя, не толькі не павялічыліся, але ў шэрагу выпадкаў нават зменшыліся.

Час, у які будуць адбывацца выступы кандыдатаў у дэпутаты, не дазваляе большасці працуючых выбарцаў пазнаёміцца з палітычнымі праграмамі сваіх кандыдатаў. Знаёмства з перадвыбарнымі праграмамі кандыдатаў будзе надзвычай абмежаваным і праз агітацыйныя матэрыялы, выробленыя на сродкі дзяржавы.

Праз штучна абмежаваную камунікацыю з выбарцамі будзе, гэткім чынам, стрымлівацца канкурэнтная барацьба паміж рознымі палітычнымі поглядамі, а альтэрнатыўныя перадвыбарчыя праграмы будуць выціскацца на перыферыю грамадскай увагі.

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**БЕЛТА**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**






**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

## Белорусы и рынок

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Брестский курьер**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы нацыянальны канал, Панорама недели**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Днепровская Неделя”**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Euroradio**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**






## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Гомельскае абласное радыё 101.3 FM**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Гомельская праўда

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






## Комсомольская правда в Белоруссии

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## ТРК “Магілёў” / ”Навіны”

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**ТРК "Магілёў" / "Новости-Регион"**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2007

**"Могилёвская Правда"**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**БЕЛТА**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Белорусы и рынок

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Брестский курьер**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Першы нацыянальны канал, Панорама недели**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Першы нацыянальны канал, Панорама недели**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Гомельскае абласное радыё 101.3 FM**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**“Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Гомельская праўда**
16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**NAVINY.BY**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Беларусь сегодня”**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Рэспубліка**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - ск. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**NAVINY.BY**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Агульнанацыянальнае тэлебачанне (АНТ)

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Рэспубліка

16.08-22.08.2008

### Адзінка вымярэння - ск. кв.






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Беларусь сегодня”**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**TUT.BY**

16.08-22.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**




